# Уладзімір Гаўрыловіч: "Духоўная спадчына продкаў - наш бясцэнны скарб"

Напярэдадні аднаго з самых знакавых культурных святаў краіны - Дня беларускага пісьменства, які ў гэтым годзе збірае гасцей у Рагачове, журналіст «ГВ» пагутарыла са старшынёй Гомельскага абласнага аддзялення грамадскага аб'яднання «Саюз пісьменнікаў Беларусі» Уладзімірам ГАЎРЫЛОВІЧАМ. Ад чаго залежыць запатрабаванасць літаратурнага говара і як захаваць культурную спадчыну для будучых пакаленняў, даведаліся ў пісьменніка.

**- Уладзімір Мікалаевіч, у нашым рэгіёне запланавана шмат мерапрыемстваў, прысвечаных і Дню беларускага пісьменства, і X Міжнароднаму фестывалю-святу «Славянскія літаратурныя дажынкі», які даўно выйшаў за межы рэспубліканскага фармату. З чаго ўсё пачыналася?**

- У 2005 годзе адбыўся ўстаноўчы сход новага Саюза пісьменнікаў Беларусі, і 12 гомельскіх літаратараў стварылі сваё рэгіянальнае аддзяленне. У асноўным у іх ліку былі творцы, добра вядомыя на ўзроўні свайго раёна. Зразумела, побач з арганізацыйнымі задачамі мне як толькі што абранаму старшыні аддзялення трэба было вырашаць і складанае пытанне «апазнавальнасці» як непасрэдна творцаў. так і самой арганізацыі. Мы гэта рабілі праз шматлікія творчыя конкурсы, якія праводзілі і самі, і сумесна з іншымі грамадскімі і дзяржаўнымі структурамі а ў 2006 годзе выспела ідэя: рабіць раз на год вялікую пісьменніцкую справаздачу перад чытачамі аб напісаным за год. Так узнікла прыдуманае мной свята «Літаратурныя дажынкі». Праект удаўся: форма правядзення спадабалася і самім літаратарам. і нытанам. А з улікам таго, што аддзяленне завязвала творчыя кантакты з пісьменнікамі-суседзямі, якія з вялікім жаданнем ехалі да нас у Гомель, свята перарасло ў міжнародны фестываль «Славянскія літаратурныя дажынкі». За 11 гадоў Гомельскае аддзяленне Саюза пісьменнікаў Беларусі вырасла да 57 літаратараў, партнёрскія дагаворы аб творчым супрацоўніцтве мы падпісалі з 7 пісьменніцкімі арганізацыямі Расіі і Украіны, маюцца дамовы і нават з муніцыпальнымі краявымі ўладнымі структурамі Расіі. Відавочна, гэта сведчанне на карысць развіцця культурных узаемаадносін паміж нашымі краінамі. У сваю чаргу, гомельскія пісьменнікі сталі своеасаблівымі пасламідобрай волі ў суседніх краінах, дзе мы прадстаўляем нашу любую Беларусь, яе літаратуру, увогуле культурную плынь. Радуе, што і наш фестываль развіваецца: на працягу апошніх 4-х гадоў сведкам творчых справаздач пісьменнікаў-славян становіцца не толькі абласная сталіца - горад над Сожам, але і райцэнтры, аграгарадкі, вёскі, дзе мы ладзім сустрэчы з чытачамі ў рамках фестывалю, дорым установам адукацыі і культуры новыя выданні.

- **Якія сумесныя праекты з расійскім альбо ўкраінскім бокам апошнім часам найбольш удалыя?**

- Іх было вельмі шмат. Напрыклад, з бранскімі калегамі мы абменьваліся творамі, альманахамі, прадстаўляючы пісьменнікаў рэгіёна на ста- ронках сваіх літаратурных выданняў. Таксама кожны год па запрашэнні калег удзельнічаем у міжрэгіянальным свяце славянскай культуры і лісьменства «На зямлі Баяна». Так, 7 нашых паэтаў і празаікаў адзначаны літаратурнымі прэміямі Баяна і Мікалая Мельнікава – нашых літаратараў вельмі палюбіў расійскі чытач. І з курскімі сябрамі ажыццяўлялі такія абменныя праекты, асабліва з міжнароднай літаратурнай арганізацыяй «Славянскія званы», мы выязджалі ў шматлікія гарады, напрыклад, былі ў Курчатаве на літаратурным фестывалі, наведалі атамную станцыю, дзяліліся вопытам з расійскай творчай моладдзю. Зараз плённа працуем з Міжнародным Саюзам пісьменнікаў і дзеячаў мастацтва, які зарэгістраваны на Украіне, нашы сябры-суседзі рыхтуюць да Дня беларускага пісьменства сумесны паэтычны зборнік «Яраслаўна».

На мой погляд, адзін з самых удалых сумесных праектаў ажыццяўляецца зараз з нашымі партнёрамі з Няклінаўскага раёна Растоўскай вобласці, Таганрога і Краснадара. Дзякуючы паэту Леаніду Северу (у свій час ён жыў з бацькамі ў Гомелі, закончыў адну з нашых школ, а потым сям’я вярнулася ў Таганрог), які захаваў любоў да Беларусі як да сваёй Радзімы, убачылі свет некалькі сумесных кніг паэтычных перакладаў. Мы яму толькі дапамагалі. Уявіце сабе: гомельскія пісьменнікі перакладаюць творы расійскіх калег на беларускую мову, а расіяне – з беларускай – творы нашых пісьменнікаў на рускую. Пасля падключылася і моладзь Гомельшчыны, Краснадарскага краю, Украіны, а затым у гэты творчы «вір» уліліся і маладыя аўтары Мінскай вобласці. У выніку да другога верасня мы падрыхтавалі цудоўны перакладчыцкі праект «Берагі дружбы» - кнігу з сабою ў Гомель прывезлі згаданы Леанід Север і старшыня Краснадарскай краявой пісьменніцкай арганізацыі Святлана Макарава. Дзякуючы фестывалю, дарэчы, з літаратурным Гомелем хочуць завязаць творчыя кантакты пісьменнікі Санкт-Пецярбурга і Масквы, расійскай Поўначы, Крыма...

- **А з чым прыйшлі на сёлетнія лгтаратурныя дажынкі гомельскія пісьменнікі?**

- З 25 аўтарскімі кнігамі. Не буду іх пералічваць, бо ўсе не змагу назваць – месца ў газеце небязмежнае. Адзначу толькі, што дзякуючы прэзідэнцкаму гранту кожная бібліятэка Беларусі займее кнігу гамяльчаніна Васіля Ткачова. Ці гэта не падстава для нашага з вамі гонару? Так. І мы павінны ганарыцца сваімі пісьменнікамі, якія працуюць на безганарарнай аснове прак тычна, ды яшчэ дораць свае кніп ўстановам адукацыі і культуры, выступаюць у школьных і іншых аудыторыях. Уявіце, толькі за першае паўгоддзе нашы пісьменнікі зрабілі звыш 900 выступленняў перад чытачамі, і найперш юнымі! І робяць гэта па клічу сэрца, хаця гэта вельмі няпроста – ісці на суд чытачоў. Дарэчы, сур’ёзна падрыхтаваліся мы і да юбілейнага фестывалю, і да Дня беларускага пісьменства. На наш погляд,

Рагачоўшчына – сапраўдны кветнік літаратуры: толькі адна асоба народнага пісьменніка Беларусі Андрэя Макаёнка чаго вартая! Невыпадкова напярэдадні свята мы выдалі кнігу «Паслядоўнікі Макаёнка. Айчына ў душах і сэрцах». Чытач сустрэнецца і з нашым 12-м нумарам альманаха «Літаратурная Гомельшчына». Для патрэб бібліятэк і вырашэння пытання апазнавальнасці літаратараў, асабліва маладых, выдалі 3 плакаты з фота і біяграфіямі членаў Гомельскага аддзялення СПБ. Таксама падрыхтавалі і выдалі камплекты буклетаў «Гомельшчына літаратурная» - кожнаму пісьменніку выдалі свій буклет (фота, короткая біяграфія і прыклад літаратурнага твора). Усё гэта і будзем прэзента ваць, можна сказаць, пасеялі няблага, неблэгі і «ўраджай» здымем.

- **Вядома, у літаратуры сустракаюцца разнастайныя тэматычныя напрамкі, кштал-ту вясковай ці гарадской прозы. Усё ж так/ як/ вектар найбольш запатрабаваны ў чытацкай аўдьпорыі менавгта ў нашы дні?**

- На мой погляд, няважна, тэматычна з чым звяз-вае свій сюжэт пісьменнік, падзеі разгортваюцца ў горадзе ці ў вёсцы. Калі тэта таленавіта і пранікнёна, калі добра выпісаны характары, калі гэта «прабівае» да слёз ад радасці ці спачування чытача, такія творы будуць запатрабаваны заўсёды. Кожны творца павінен бачыць перад сабой свайго чытача і час ад часу ставіць сябе на яго месца. Саюз пісьменнікаў, дарэчы, нядаўна рабіў аналіз запатрабаванасці 100 аўтараў Беларусі ў чытацкай аудыторыі. Хачу сказаць, што ёсць гомельскія творцы, кнігі якіх бралі за год больш за 2000 чытачоў нашай вобласці. Відавочна, толькі якасны твор можа быць у цэнтры ўвагі – падробкі тут не пройдуць.

- **На вашу думку, ці варта называць літаратурны твор спецыфічным пісьменніцкім прадуктам, які ствараецца ў тым ліку дзеля продажу?**

- Зразумела, што пісьменнік – такі ж чалавек, як усе. Ён таксама хоча есці, расціць дзяцей. Так і ёсць у многіх краінах свету, калі кніга прыносіць салідны прыбытак творцу. Мы ж гэтым пахваліцца не можам, таму што ганарарныя выдавецкія стаўкі вельмі скупыя – адзін месяц наўрад ці на атрыманы ганарар за кнігу, якая пісалася некалькі гадоў, пражывеш. Застаецца спонсарская падтрымка ды, калі ёсць, уласныя сродкі, каб выдаць кнігу. Тыя імёны, якія сёння на слыху ў Беларусі, - за іх плячыма нярэдка сур'ёзныя фундатары, хаця сапраўднага мастацкага твора ў гэтага аўтара, прама скажам, часам бракуе, але ж ёсць грошы. Для нашых пісьменнікаў сёння галоўны фундатар – ён сам, у нейкай ступені пісьменніцкая арганізацыя ды дзяржава, якая адкрывае дзверы. Калі ты зрабіў нешта высокамастацкае – дык ідзі, данясі да чытача. Хацелася б, каб сапраўдным талентам і выдатным творам больш увагі ўдзялялі СМІ – прачытае журналіст, змацыйна перадасць свае ўражанні ў газеце – бачыш, ужо чарга за кнігай, няхай не ў краме, дык у бібліятэцы. У краме – дорага, кусаюцца цэны на нашу кніжку. Нягледзячы ні на што, мы, пісьменнікі, працуем для нацыі, каб людзі далучаліся да мовы і кнігі, культуры і мастацкага слова.

**- Уладзімір Мікалаевіч, Дзень беларускага пісьменства набывае асаблівую значнасць, улічваючы той факт, што гэты год аб'яўлены Годам культуры. Як захаваць культурную спадчыну, здабытую мінулымі пакаленнямі, і перадаць яе нашчадкам?**

- Чалавецтва не дасягнула б сучаснай ступені развіцця без пісьменства, якое зрабіла нас духоўна багатымі. Добра, што быў Год кнігі ёсць Год культуры. Гэта пасыл дзяржавы: людзі, цікаўцеся сваім, родным, беражыце тое. што захавалі вашы продкі. А мова ж найперш — душа народа, толькі праз яе народ з пакалення ў пакаленне перадае свій светапогляд. нэцыянальныя традыцыі і каштоўнасці. Вось што трэба берагчы як зранку вока! Так, кожны чалавек сам сабе павінен адказаць на гэта няпростае пытанне. Канешне, сёння нялёгкае жыццё, але ж ці былі ў нашых бацькоў лёгкія часы? Я цяпер часта, сустракаючыся з чытачамі, кажу: калі перад тым, як надумаецеся самі ці дадзіце згоду закапаць занядбаную матчыну хату, не забераце з яе ў сваю гарадскую кватэру самае каштоўнае. што было жыццём, асновай яго для бацькоў і дзядоў, - той жа абраз з чырвонага кутка, - цана вам, як людству, невялікая. Вельмі хачу, каб мы былі ўсё ж нацыяй, здольнай дбаць і пра духоўную спадчыну сваіх продкаў. І вучыць гэтаму сваіх дзетак, з першага дня нараджэння на свет Божы.

**- А чым новым парадуе чьггачоў празаік / публіцыст Уладзімір Гаўрыловіч?**

- Прозу пішу зараз няшмат, таму што журналісцкая работа забірае душу і сэрца. Але працую над новым раманам. Хаваць не стану: твор накіраваны супраць тых. хто папіхаў з-за збегу пэўных акалічнасцяў слабога, але шчырага, адданага справе чалавека, дагаджаючы пакуль дужым, але ж часовым ва ўсіх адносінах людзям. Даследую паводзіны чалавека ў канкрэтных жыццёвых сітуацыях і шукаю адказ на пытанне: ці павінен ён заставацца сумленным у адносінах да такіх людзей? Разам з тым па творчай задуме твор будзе сягаць і ў гістарычную раку X стагоддзя, закранаць падзеі на святой Тураўскай зямлі і «мець закрутку» на сённяшні, такі нялёгкі час. Гэта спроба адказаць на пытанне: калі ж легка было жыць чалавеку на Зямлі? Праўда, да таго, калі будзе пастаўлена кропка пад апошнім сказам, яшчэ далёка. Дарэчы, на свята беларускага пісьменства еду таксама не з пустымі рукамі – ёсць чым парадаваць чытача: у мінскім выдавецтве «Чатыры чвэрці» выйшла шыкоўная кніга-альбом «Тураўская рапсодыя». Там я больш лірык-публіцыст, напісанае – пра маю малую радзіму, і дзякуючы гэтаму прыгожаму выданню пра яе даведаецца яшчэ больш людзей.

**- Поспеху святу, усім яго ўдзельнікам, шчасця і новых твораў вам!**

- Віншую ад імя пісьменніцкай сям'і Гомельшчыны беларусаў з Днём беларускага пісьменства, асабліва рагачоўцаў і жыхароў раёна з доўгачаканым святам. Мяркую, яно атрымаецца яркім, запамінальным, і спадзяюся на цёплыя сустрэчы з чытачамі і ў Гомелі, і ў Рагачове!

Кіра ЛЯВІЦКАЯ